**ЗАЦВЕРДЖАНА**
Загад Вышэйшай атэстацыйнай
камісіі Рэспублікі Беларусь
ад «07» ліпеня 2014 г. № 169

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРАГРАМА-МІНІМУМ
**кандыдацкага экзамену па спецыяльнасці**
24.00.03 – музеязнаўства,
кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб'ектаў
(культуралогія)

Мінск
БДУКМ
2014

**АРГАНІЗАЦЫЯ-РАСПРАЦОЎШЧЫК:**
установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**АЎТАРЫ-РАСПРАЦОЎШЧЫКІ:**

**Бяспалая Марыя Аркадзьеўна,** доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;
**Нароўская Ала Мікалаеўна,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;
**Трусаў Алег Анатольевіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;
**Краснова Яўгенія Леанідаўна,** кандыдат культуралогіі, выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;
**Лупашка Ірына Генадзьеўна,** кандыдат культуралогіі, выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;
**Бамбешка Іванна Іванаўна,** старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
**Гужалоўскі Аляксандр Аляксандравіч,** доктар гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта;
**Джумантаева Тамара Аляксандраўна,** кандыдат культуралогіі, дырэктар навукова-даследчай і асветнай установы культуры «Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УСТУП

Праграма-мінімум кандыдацкага экзамену па спецыяльнасці «музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб'ектаў» з'яўляецца абавязковай у працэсе падрыхтоўкі аспірантаў адпаведна навуковай спецыяльнасці. Структура яе ўключае тры асноўныя раздзелы: тэарэтычныя аспекты музейнай справы, гісторыя музейнай справы і ахова гісторыка-культурнай спадчыны.

## Мэта і задачы праграмы

**Мэтай** праграмы-мінімум па спецыяльнасці 24.00.03 – музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб'ектаў (культуралогія) з'яўляецца выяўленне ўзроўню тэарэтычнай і прафесійнай падрыхтоўкі саіскальніка вучонай ступені, валоданне сучаснымі метадамі ў галіне навуковага даследавання, веданне ім агульных канцэпцый, галоўных тэарэтычных і практычных праблем музеязнаўства, гісторыі музейнай справы, валоданне фактычным матэрыялам; выяўленне здольнасці саіскальніка арыентавацца ў навуковай літаратуры, у перыядычных выданнях у галіне музеязнаўства.

**Задачамі** праграмы-мінімума з'яўляюцца:

– асваенне агульных прынцыпаў і метадаў навуковага аналізу праблем музеязнаўства, кансервацыі і рэстаўрацыі гісторыка-культурных аб'ектаў;

– вылучэнне асноўных кірункаў развіцця музеязнаўства, якія адлюстроўваюць сутнасныя аспекты эвалюцыі музейнай справы, рэстаўрацыі і кансервацыі гісторыка-культурных аб'ектаў;

– веданне агульных заканамернасцей функцыянавання музеяў, асаблівасці дзейнасці асноўных іх тыпаў і ўласцівых ім базісных структур;

– валоданне асноўнымі навуковымі падыходамі да вызначэння праблем музеязнаўства, характарыстыка прыярытэтных, культуралагічных, гістарычных, музеязнаўчых крыніц, якія адлюстроўваюць галоўныя тэндэнцыі сучаснага музеязнаўства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПАТРАБАВАННІ ДА ЎЗРОЎНЮ ВЕДАЎ САІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

Саіскальнік вучонай ступені павінен ведаць:

– вызначэнне, структуру музеязнаўства як навукі, яго месца ў сістэме гуманітарных навук;

– асаблівасці развіцця музейнай справы на асобных этапах гістарычнага развіцця;

– тэарэтычныя асновы музейнай справы;

– асаблівасці навукова-фондавай работы музея;

– спецыфіку экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці музея;

– формы і метады культурна-адукацыйнай дзейнасці музея;

– тэарэтычныя, метадычныя і арганізацыйныя асновы аховы гісторыка-культурнай спадчыны;

– сучасны стан і праблемы дзяржаўнага ўліку і аховы гісторыка-культурных аб'ектаў;

– тэарэтычныя і метадычныя асновы захавання, кансервацыі і рэстаўрацыі музейных прадметаў.

## ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ-МІНІМУМА

### Раздзел І. МУЗЕЙНАЯ СПРАВА. ТЭОРЫЯ

**Ключавыя словы:** *музеязнаўства, музейны прадмет, фонды музея, навукова-фондавая работа, музейная экспазіцыя, экспанат, экспазіцыйна-выставачная дзейнасць, экскурсія, культурна-адукацыйная дзейнасць.*

#### 1. Агульная тэорыя музеязнаўства

*Музеязнаўства як навука.* Вызначэнне музеязнаўства як навукі. Аб'ект і прадмет музеязнаўства. Падыходы да вызначэння прадмета музеязнаўства. Сучасная праблематыка музеязнаўства. Структура музеязнаўства.

*Метады музеязнаўства.* Мова музеязнаўства. Музейныя тэрміналагічныя слоўнікі. Месца музеязнаўства ў сістэме грамадскіх, тэхнічных і прыродазнаўчых навук. Міжпрадметны характар музеязнаўства.

*Гістарыяграфія музеязнаўства (музеялогіі).* Асноўныя этапы станаўлення музеязнаўства. Першыя даследаванні па музеязнаў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стве. С. фон Кічаберг (1565), Ё. Д. Маёр (1674), К. Ф. Нікеліус (1727), К. Ліней (1753), Г. Клем (1837). Тэарэтычныя пытанні музеязнаўства ў першых перыядычных выданнях. «Часопіс па музейнай і антыкварнай справе» (Дрэздэн, 1878), «Музейны часопіс» (Лондан, 1901) і інш. Развіццё музейнай перыёдыкі. Распрацоўка пытанняў музеязнаўства ў XX ст. Утварэнне і дзейнасць Міжнароднага камітэта па музеялогіі (ІКАФОМ).

*Фарміраванне нацыянальных школ у галіне музеязнаўства.* Заходнееўрапейская (К. Хадсан, Д. Льюіс, Ж. А. Рыўер, Д. Ромедэр і інш.), усходнееўрапейская (Ё. Бенеш, З. Странскі, І. Няўступны, Ё. Аве, В. Хербст, В. Глузіньскі, У. Свяцімскі), амерыканская (Д. Камерон, В. Вошберн, Ж. Буркоў і інш.), расійская (А. М. Разгон, М. Б. Гнядоўскі, У. Ю. Дукельскі, Т. П. Палякоў, А. І. Міхайлоўская, С. А. Каспарынская, Д. А. Равіковіч і інш.) школы.

*Музеязнаўства ў Беларусі.* Працы А. А. Грыцкевіча, А. А. Гужалоўскага, А. М. Калбаскі, Т. А. Джумантаевай, Г. Г. Нячаевай і інш. Дзейнасць лабараторыі музейнага праектавання і Інстытута культуры Беларусі. «Музейныя сшыткі».

*Музейны прадмет і яго ўласцівасці.* Гістарыяграфія музейнага прадмета. Вызначэнне музейнага прадмета. Праблема ўзаемаадносін: прадмет музейнага значэння – музейны прадмет – музейны экспанат. Музейны прадмет як крыніца ведаў і эмацыянальнага ўздзеяння. Асноўныя ўласцівасці музейнага прадмета. Паняцце музеальнасці.

*Аналіз каштоўнасці музейнага прадмета.* Паняцце тыповых і ўнікальных музейных прадметаў. Функцыі музейнага прадмета. Узроўні камунікацыі музейнага прадмета. Узнаўленне музейных прадметаў і іх выкарыстанне ў музейнай дзейнасці. Класіфікацыя музейных прадметаў. Найноўшыя тэндэнцыі да вызначэння музейнага прадмета.

*Музей як сацыяльны інстытут.* Этымалогія паняцця «музей». Тэорыі ўзнікнення музея ў грамадстве. Этапы фарміравання музея як сацыяльнага інстытута. Вызначэнне тэрміна «музей». Спецыфіка музея. Сацыяльныя функцыі музеяў. Класіфікацыя і тыпалогія музеяў. Паняцце музейнай сеткі. Музейны турызм.

*Музейная архітэктура.* Прыстасаванне і выкарыстанне архітэктурных аб’ектаў пад музеі. Патрабаванні да будаўніцтва музейных будынкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Музейная камунікацыя.* Распрацоўка праблемы ў працах Д. Камерона, А. Хупер-Грынхіл, Б. М. Гнядоўскага, В. У. Бяззубавай, А. Ю. Вальковіч, В. С. Сапанжы. Музей як знакавая сістэма. Погляды навукоўцаў М. А. Нікішына, Т. П. Палякова на сутнасць музейнай камунікацыі.

*Інфармацыйныя тэхналогіі ў музеі.* Мультымедыя ў музеі. Электронныя экспазіцыі. Музейныя сайты і прадстаўніцтвы ў сацыяльнай сетцы. Віртуальныя музеі.

*Музейны менеджмент і маркетынг.* Арганізацыя і кіраванне музейнай дзейнасцю. Фандрэйзінг. Рэклама. Музейныя тавары і паслугі. PR-стратэгіі ў музеі. Партнёрскія ўзаемаадносіны музея з іншымі сацыякультурнымі і турыстычнымі ўстановамі.

*Музейная сацыялогія.* Асаблівасці вывучэння наведвальнікаў музеяў з выкарыстаннем сацыялагічных метадаў. Вывучэнне музейнай аўдыторыі ў розных краінах свету.

*Музейная адукацыя.* Магчымасці для атрымання музейнай адукацыі ў Беларусі і за мяжой. Музейныя гранты і праграмы.

## 2. Навукова-фондавая дзейнасць музея

*Фонды музея. Асноўныя напрамкі фондавай работы.* Вызначэнне паняцця «фонды музея». Музейныя прадметы як аснова фондавай работы. Сістэма навуковай арганізацыі музейных прадметаў. Паняцці «музейная калекцыя» і «музейны збор». Навукова-дапаможныя матэрыялы музеяў. Умовы дзейнасці музейных фондаў. Навуковая арганізацыя фондаў музея. Структура фондаў па значэнні і юрыдычным стане прадметаў. Склад фондаў. Асноўныя кірункі і змест фондавай работы. Нарматыўна-прававое забеспячэнне навукова-фондавай работы.

*Камплектаванне музейных фондаў.* Асноўныя мэты і задачы камплектавання фондаў. Навуковае камплектаванне музейных фондаў як састаўны элемент навуковага дакументавання і калекцыяніравання. Навуковая канцэпцыя камплектавання музейных фондаў.

*Віды камплектавання музейных фондаў.* Тэматычнае, сістэматычнае і комплекснае камплектаванне музейных фондаў.

*Арганізацыя работы па камплектаванні фондаў.* Планаванне камплектавання фондаў. Крыніцы і арганізацыйныя формы камплектавання. Формы бягучага камплектавання. Арганізацыя і правядзенне палявых даследаванняў з мэтай камплектавання фондаў. Прынцыпы камплектавання фондаў прадметамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сучаснасці. Дзейнасць фондава-закупачнай камісіі. Парадак карыстання музейнай фондавай дакументацыяй.

*Вывучэнне музейных прадметаў і калекцый*. Паняцце вывучэння музейных прадметаў. Атрыбуцыя музейнага прадмета. Выяўленне асноўных адзнак прадмета. Сувязь музейнага прадмета з гістарычнымі падзеямі і асобамі. Выяўленне этнічнай прыналежнасці. Расшыфроўка клеймаў, надпісаў і іншых знакаў.

*Вызначэнне аўтэнтычнасці і верагоднасці музейнага прадмета*. Вызначэнне навуковай, гістарычнай, мемарыяльнай і мастацкай каштоўнасці музейнага прадмета. Яго музейная каштоўнасць. Класіфікацыя і сістэматызацыя музейных прадметаў.

*Крытычны аналіз і інтэрпрэтацыя музейных прадметаў*. Методыка вывучэння і навуковага апісання розных катэгорый музейных прадметаў. Асаблівасці вывучэння музейных прадметаў сучаснасці. Атрыбуцыя і інтэрпрэтацыя музейных прадметаў. Дэгіталізацыя (алічбоўка) музейных прадметаў.

*Улік музейных фондаў*. Паняцці «ўлік музейных фондаў», «уліковая дакументацыя», «сістэма фондавай дакументацыі». Навукова-фондавая дакументацыя як умова юрыдычнай аховы музейных збораў. Нарматыўныя дакументы па ўліку фондаў.

*Прыём музейных прадметаў і іх першасная інвентарызацыя*. Улік фонду навукова-дапаможных матэрыялаў. Улік фонду часовага захавання. Улік музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў. Улік зброі і боепрыпасаў. Афармленне выдачы музейных прадметаў і навукова-дапаможных матэрыялаў.

*Навуковая інвентарызацыя музейных прадметаў як другая ступень уліку*. Нанясенне на прадметы ўліковых адзнак. Рэгістрацыя ўліковай дакументацыі, яе захаванне і ахова.

*Навуковая каталагізацыя музейных фондаў*. Зводны каталог музея (генеральны каталог) – звод даных аб складзе і змесце музейнага збору.

*Інфармацыйныя тэхналогіі ў фондавай рабоце*. Дзяржаўны каталог музейнага фонду Рэспублікі Беларусь.

*Захаванне музейных фондаў*. Захаванне музейных фондаў як адзін з галоўных напрамкаў фондавай работы. Нарматыўныя дакументы па захаванні музейных фондаў. Агульныя патрабаванні да архітэктуры музейных будынкаў. Фондасховішча і яго абсталяванне. Асобнае і комплекснае захаванне музейных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадметаў. Стварэнне ўмоў для навуковай апрацоўкі і выкарыстання музейных фондаў.

*Ахова музейных фондаў.* Забеспячэнне фізічнай захаванасці музейных прадметаў. Аўтаматызаваныя сістэмы аховы і сігналізацыі. Пажарная сістэма бяспекі фондасховішчаў. Аўтаматызаваныя сістэмы супрацьпажарнай аховы.

*Рэжымы захавання музейных фондаў.* Тэмпературна-вільготнасны рэжым. Ахова ад забруджанага паветра. Светлавы рэжым. Біялагічны рэжым. Ахова ад механічных пашкоджанняў. Ахова музейных фондаў у экстрэмальных сітуацыях. Асаблівасці захавання музейных прадметаў у экспазіцыі. Адкрытае захаванне музейных фондаў. Асобнае і комплекснае захаванне музейных прадметаў.

Упакоўка і транспарціроўка музейных прадметаў.

### 3. Экспазіцыйна-выставачная дзейнасць музея

*Прынцыпы і метады пабудовы экспазіцыі.* Паняцце «музейная экспазіцыя». Прынцыпы і метады пабудовы музейных экспазіцый. Тэматычная структура экспазіцый. Экспазіцыйныя комплексы. Асноўныя віды экспазіцыйных матэрыялаў. Музейныя прадметы ў экспазіцыі. Вызначэнне паняцця «экспанат». Рэчавыя помнікі і выяўленчыя матэрыялы. Пісьмовыя крыніцы і дакументальныя фотаматэрыялы. Экспазіцыйныя навукова-дапаможныя матэрыялы. Карты, схемы, дыяграмы, табліцы. Тэксты, этыкетаж і ўказальнікі. Асаблівасці пабудовы экспазіцыі музеяў розных профіляў.

*Навуковае праектаванне экспазіцыі.* Асноўныя этапы стварэння музейнай экспазіцыі. Праектаванне экспазіцыі. Роля навуковых супрацоўнікаў-экспазіцыянераў. Навуковая канцэпцыя. Экспазіцыйная ідэя. Тэматычная структура (ТС). Падбор матэрыялаў. Разгорнутая тэматычная структура (РТС). Фарміраванне тэматыка-экспазіцыйных комплексаў. Тэматыка-экспазіцыйны план (ТЭП). Падрыхтоўка тэкставага і дапаможнага матэрыялу. Экспазіцыйны сцэнарый. Тэатралізацыя экспазіцыйнай прасторы.

*Асноўныя прынцыпы мастацкага праектавання музейных экспазіцый.* Задачы мастацкага праектавання. Асаблівасці мастацкага рашэння музейнай экспазіцыі. Арганізацыя прадметна-прасторавага асяроддзя. Абсталяванне ў экспазіцыйнай прасторы. Святло і колер у ансамблі экспазіцыі. Асацыятыўнасць і ка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эфіцыент адлюстравання колеру. Графічны дызайн у экспазіцыі. Этыкетаж. Метады паказу экспанатаў. Пастаянныя і часовыя экспазіцыі. Камплектаванне перасоўных выстаў з фондаў музея.

*Арганізацыя і асноўныя этапы мастацкага праектавання музейных экспазіцый.* Арганізацыя мастацкага праектавання. Генеральнае рашэнне экспазіцыі. Асноўныя мастацкія прынцыпы пабудовы музейнай экспазіцыі. Размяшчэнне асноўных тэм у залах. Прынцыпы асвятлення і каляровага рашэння экспазіцыі. Выраб абсталявання. Выкарыстанне сучасных тэхнічных сродкаў у экспазіцыі. Экспазіцыйны маршрут.

*Эскізны праект.* Размяшчэнне вядучых экспанатаў і тэкстаў. Экспазіцыйны пояс. Прыёмы размяшчэння экспанатаў у экспазіцыйнай прасторы. Метады паказу.

*Рабочае праектаванне.* Мантажныя аркушы. Распрацоўка эскізаў і рабочых чарцяжоў. Камунікацыйныя лініі, вентыляцыя і пажарна-ахоўная сігналізацыя. Арганізацыя мастацка-выканаўчых работ. Арганізацыя мантажу экспазіцыі.

## 4. Культурна-адукацыйная дзейнасць музея

*Станаўленне і развіццё культурна-адукацыйнай дзейнасці музея.* Музеі ў сацыякультурнай структуры грамадства. Эвалюцыя культурна-адукацыйнай дзейнасці і суадносіны гэтага працэсу з адпаведнымі сацыякультурнымі ўмовамі. Развіццё музейнай культурна-адукацыйнай дзейнасці ў розных краінах.

*Музейная педагогіка як навуковая дысцыпліна.* Перадумовы станаўлення музейнай педагогікі як навуковай дысцыпліны. Аб’ект, прадмет, праблемнае поле музейнай педагогікі. Мэты і задачы даследаванняў у галіне музейнай педагогікі.

*Педагагічныя асновы культурна-адукацыйнай дзейнасці музея.* Асноўныя катэгорыі і тэрміналагічны апарат музейнай педагогікі. Адаптацыя агульнапедагагічных метадаў да рэалізацыі адукацыйна-выхаваўчай функцыі музея. Музейна-педагагічныя прынцыпы. Асоба музейнага педагога. Музейна-педагагічныя цэнтры.

*Музейная аўдыторыя.* Вызначэнне музейнай аўдыторыі. Параметры для характарыстыкі музейнай аўдыторыі. Вывучэнне зваротнай сувязі паміж музеем і яго аўдыторыяй. Музейная аўдыторыя як аб’ект даследавання. Музейная сацыялогія як сродак вывучэння музейнай аўдыторыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Паняцце «музейная культура».* Узроўні музейнай культуры. Рэкамендацыі па выхаванні музейнай культуры.

*Формы культурна-адукацыйнай дзейнасці музея.* Класіфікацыя форм культурна-адукацыйнай дзейнасці музея. Асноўныя характарыстыкі базавых форм культурна-адукацыйнай дзейнасці музея. Экскурсія як асноўная форма, яе спецыфіка і сутнасць. Класіфікацыя экскурсій. Методыка падрыхтоўкі і правядзення экскурсіі.

*Іншыя базавыя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці музея.* Музейная лекцыя і яе спецыфіка. Асаблівасці музейных клубаў, гурткоў і студый. Правядзенне конкурсаў, алімпіяд, віктарын і іншых мерапрыемстваў з улікам музейнай тэматыкі. Новыя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці музея: музейнае свята, музейныя заняткі. Тэатралізацыя ў музейнай прасторы.

*Асноўныя метады работы з рознымі катэгорыямі музейнай аўдыторыі.* Метады культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў. Псіхалагічныя асаблівасці ўспрымання музейнай інфармацыі рознымі катэгорыямі наведвальнікаў. Залежнасць метадаў работы ад характарыстыкі музейнай аўдыторыі. Асноўныя метады работы з дашкольнікамі і малодшымі школьнікамі. Асаблівасці работы з вучнямі сярэдніх і старшых класаў. Спецыфіка работы са студэнтамі.

Асаблівасці методыкі работы музея з сямейнымі і адзінкавымі наведвальнікамі. Работа з замежнымі наведвальнікамі.

## 5. Навукова-даследчая работа ў музеі

*Сутнасць і спецыфіка музея як навукова-даследчай установы.* Асноўныя напрамкі даследаванняў у музеі і іх узаемаадносіны. Музеялагічныя даследаванні і іх рэалізацыя ў розных сферах музейнай дзейнасці. Профільна-навуковыя даследаванні музея. Арганізацыя і планаванне навукова-даследчай работы ў музеях.

Супрацоўніцтва з іншымі навуковымі ўстановамі. Музейныя навуковыя публікацыі. Арганізацыя навуковых канферэнцый, семінараў, круглых сталоў.

Работа з музейнымі фондамі і архівамі. Даступнасць музейных фондаў для навукоўцаў.

Вывучэнне пытанняў музеефікацыі і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Раздзел 2. МУЗЕЙНАЯ СПРАВА. ГІСТОРЫЯ

**Ключавыя словы:** *гісторыя музейнай справы, крыніцазнаўства і гістарыяграфія, музейныя зборы, прыватныя калекцыі, публічныя музеі, музеі навучальных устаноў, музеі навуковых устаноў, прыватныя і дзяржаўныя музеі.*

## 1. Тэарэтычныя аспекты гісторыі музейнай справы

*Гісторыя музейнай справы як структурная адзінка музеязнаўства.* Аб'ект і прадмет гісторыі музейнай справы. Праблематыка і метады вывучэння гісторыі музейнай справы. Перыядызацыя гісторыі музейнай справы.

## 2. Крыніцазнаўства і гістарыяграфія гісторыі музейнай справы

*Крыніцазнаўства гісторыі музейнай справы.* Характарыстыка і класіфікацыя крыніц па гісторыі музейнай справы. Класіфікацыя пісьмовых крыніц. Сістэматызацыя пісьмовых крыніц. Іншыя віды крыніц.

*Гістарыяграфія гісторыі музейнай справы.* Гісторыя музейнай справы ў навуковых даследаваннях Новага часу: К. Найкель і І. Канольд (1727), В. Бётыгер (1808). Агляд дзейнасці асобных музеяў у працах Л. фон Ледэбура (1831), Г. Клема (1837), Э. Банафе (1837), Э. Курцыуса (1870) і інш.

Даследаванні па ўсеагульнай гісторыі музейнай справы Д. Мэры (1904). Работы па гісторыі музейнай справы ў асобных краінах свету: І. фон Шлосер (1908), В. Шэрэр (1913), Ф. Шміт (1919). Гісторыя калекцыяніравання ў працах Ф. Тэйлара (1948), Н. ван дэр Хольста (1960), Х. Закса (1971). Даследаванні А. Уітлін (1949, 1970) аб агульных тэндэнцыях развіцця музейнай справы ў свеце. Праблемы гісторыі музеяў і пытанні рэфармавання музейнай справы ў другой палове XX ст. у даследаваннях Г. Александэра (1979, 1983), З. Жыгульскага-малодшага (1982), К. Шрайнера (1983–1986), Дж. Льюіса (1984) і інш.

Гістарыяграфія ў вобласці музейнай справы савецкага і постсавецкага перыяду. Выданне «Нарысаў гісторыі музейнай справы ў Расіі і СССР» калектывам гісторыкаў пад кіраўніцтвам А. М. Разгона (1957–1971). Працы Г. Р. Мезенцавай (1959), Н. С. Садыкавай (1975), А. І. Фралова (1991), С. А. Каспарын-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скай (1992), В. П. Грыцкевіча (2002) і інш. Распрацоўка праблем гісторыі музейнай справы ў Беларусі. Працы Б. Р. Брэжга, Г. А. Каханоўскага, Л. В. Аляксеева, А. А. Гужалоўскага і інш.

## 3. Дамузейнае збіральніцтва ў Старажытным свеце і Сярэднявеччы

*Збіральніцтва рэчаў у Старажытным свеце.* Класіфікацыя дамузейных збораў, распрацаваная А. Уітлін. Зборы эканамічнага значэння. Зборы сацыяльнага прэстыжу. Магічныя і іншыя рытуальныя зборы. Зборы як сродак стымуляцыі цікавасці да навакольнага свету. Зборы як сродак эмацыянальнага ўспрымання.

*Перадмузейныя зборы ў перыяд старажытных цывілізацый.* Перадмузейнае збіральніцтва ў Старажытнай Грэцыі. Храмавыя зборы як праваобраз музеяў мастацтва. Сховішчы карцін (пінакатэкі), скульптур (гліптатэкі), каштоўных камянёў. Александрыйскі і Пергамскі мусеёны. Перадмузейнае збіральніцтва ў Старажытным Рыме. З’яўленне першых прыватных калекцый.

*Перадмузейныя зборы ў раннім Сярэднявеччы.* Заснаванне дзяржаўных скарбніц. Княжацкія, манастырскія, храмавыя і іншыя зборы. Збіральніцтва ў раннесярэднявечных беларускіх княствах.

## 4. Узнікненне музея як сацыякультурнага інстытута ў эпоху Адраджэння

*Гісторыка-культурныя перадумовы станаўлення музейнай справы ў эпоху Адраджэння.* З’яўленне першых даследаванняў у галіне музеязнаўства. Зараджэнне музейнай тэрміналогіі.

Збіральніцтва ў эпоху Адраджэння ў Італіі як праява рэнесансных адносін да гістарычнага мінулага. Калекцыянеры і прыхільнікі мастацтва. Распаўсюджванне збіральніцтва ў Францыі, Нідэрландах, Англіі і германскіх землях. Прыватныя калекцыі магнацкіх родаў у Беларусі.

Змены ў сацыяльным складзе збіральнікаў і калекцыянераў. Фарміраванне асобных спецыялізаваных калекцый, узнікненне першых устаноў музейнага тыпу, з’яўленне музеяў мастацкага, прыродазнаўчага, навукова-тэхнічнага і гістарычнага профіляў.

Прадстаўленне прадметаў у калекцыях. Даступнасць тагачасных калекцый для публікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5. Фарміраванне музея як сацыякультурнага інстытута ў эпоху Асветніцтва

Абсалютызацыя ролі навукі. Пашырэнне кругагляду чалавека пад уплывам развіцця прыродазнаўчых навук і навукова-тэхнічнай рэвалюцыі XVIII ст. З'яўленне навуковых таварыстваў, адкрыццё акадэмій навук, універсітэтаў і іх уплыў на развіццё культуры і музея як яе феномена.

Папулярызацыя ў музеях дасягненняў навукі і твораў мастацтва як увасабленне асветніцкіх ідэй. Пашырэнне прыватнага калекцыяніравання. Змены сацыяльных функцый збіральніцтва. Шматпрофільнасць прыватных збораў. Разнастайнасць тыпаў музеяў і музейных збораў у Еўропе: кунсткамеры, пінакатэкі, арсеналы (цэйхгаўзы) і інш. Адкрыццё першых публічных музеяў у Заходняй і Усходняй Еўропе.

Фарміраванне палацавых калекцый мастацтва. Прыватныя калекцыі твораў мастацтва. Асаблівасці збораў прыродазнаўчага характару і іх уплыў на развіццё адпаведных навук. Прыватныя зборы прыродазнаўчага характару. Навукова-тэхнічныя музеі. Музеі гістарычнага профілю.

*Развіццё музейнай справы ва Усходняй Еўропе*. Дасягненні Пятра I у справе захавання і збору прадметаў. Дзяржаўныя і прыватныя калекцыі. Фарміраванне калекцыі Зброевай палаты. Пецярбургская Кунсткамера (1714).

*Музейная справа ў Беларусі*. З'яўленне музеяў пры навучальных установах. Прыватныя мастацкія калекцыі ў Беларусі. Прыватныя зборы натуральнага характару. Элементы вайсковых калекцый у магнацкіх зборах (Нясвіж, Дзярэчын).

## 6. Пераўтварэнне музеяў у агульнадаступныя ўстановы ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.

Агульныя тэндэнцыі сацыякультурнага развіцця грамадства. Уплыў рамантызму на сацыякультурную сітуацыю. Працэс дэмакратызацыі музейных устаноў пад уплывам ідэй Вялікай французскай буржуазнай рэвалюцыі і буржуазных рэвалюцый першай паловы XIX ст. З'яўленне нацыянальных музеяў у краінах Заходняй Еўропы і Амерыкі.

*Развіццё музеяў у Заходняй Еўропе*. Мастацкія музеі і іх развіццё. Стварэнне мастацкіх музеяў у Францыі, Германіі і іншых краінах. Роля Ж. Вакансона ў папулярызацыі ведаў у галіне навукі і тэхнікі. Развіццё навукова-тэхнічных музеяў. Спе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыялізацыя музеяў прыродазнаўча-навуковага профілю. Нацыянальная кансерваторыя мастацтваў і рамёстваў (Парыж, 1794). Навукова-тэхнічныя музеі Вялікабрытаніі. Прамысловыя і сельскагаспадарчыя выставы ў Еўропе і Расійскай імперыі і іх уплыў на фарміраванне музейных калекцый. Развіццё гістарычных музеяў як вынік росту нацыянальнай свядомасці. Стварэнне ваенна-гістарычных музеяў, музеяў нацыянальнай славы. Новыя формы папулярызацыі ведаў пра грамадства і прыроду: панарамы, перасоўныя выставы амерыканскага збіральніка Ф. Барнума, паноптыкум М. Цюсо. Прадстаўленне прадметаў у тагачасных музеях.

*Развіццё музеяў у Расійскай імперыі.* Фарміраванне калекцыі Эрмітажа, імператарскія калекцыі ў Царскім Сяле і Пецяргофе. Музеі навуковых і навучальных устаноў. Музей Акадэміі мастацтваў (1758). Першыя праекты стварэння нацыянальнага музея ў Расійскай імперыі. Румянцаўскі музей (1831). Фарміраванне калекцыі Траццякоўскай галерэі (1865). Гістарычны музей у Маскве (1872), Політэхнічны музей (1872), Рускі музей (1895).

*Пашырэнне прыватнага збіральніцтва ў Беларусі.* Прыватныя і вучэбныя прыродазнаўчыя калекцыі і кабінеты. Узнікненне крыніцазнаўчага падыходу ў збіральніцтве. Стварэнне гістарычных калекцый.

## 7. Спецыялізацыя музеяў у другой палове XIX – пачатку XX ст.

*Развіццё спецыялізаваных музеяў.* Уплыў навуковых і тэхналагічных адкрыццяў, развіцця гандлю і прамысловасці, транспарту на стан музейнай справы. Прамысловыя выставы і адкрыццё адпаведных музеяў. Мастацкія (у іх ліку прыкладнога і сучаснага мастацтва), прыродазнаўча-навуковыя, навукова-тэхнічныя, гістарычныя (у іх ліку ваенна-гістарычныя, этнаграфічныя, царкоўна-гістарычныя) і іншыя музеі.

Роля мецэнацтва, прыватнага калекцыяніравання, антыквараў і гандляроў мастацкімі каштоўнасцямі ў развіцці мастацкіх музеяў. Павышэнне цікавасці да народнай культуры і захавання помнікаў. Першыя этнаграфічныя выставы і сусветныя выставы і іх роля ў стварэнні этнаграфічных музеяў. Стварэнне музеяў пад адкрытым небам. Краязнаўчы і радзімазнаўчы рух у Еўропе. Стварэнне гістарычных музеяў у шматнацыянальных дзяржавах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Фарміраванне музейнай прафесіі, музейнай грамадскасці.* Музеязнаўчыя з'езды, канферэнцыі, выданні. Музеязнаўчая адукацыя і прапаганда.

*Уздым музейнага руху ў Беларусі.* Стварэнне агульнадаступных музеяў на падставе прыватнай ініцыятывы. Царкоўна-археалагічныя музеі і іх роля ў захаванні і вывучэнні гісторыка-культурнай спадчыны. Музеі пры ўпраўленні дзяржаўных маёмасцей, губернскіх статыстычных камітэтах, земствах. Дзейнасць навуковых устаноў па стварэнні музеяў Беларусі.

Павелічэнне колькасці вучэбных музеяў пры сярэдніх навучальных установах Беларусі.

*Росквіт прыватнага збіральніцтва ў Беларусі.* Мастацкія зборы. Спецыялізацыя сярод збіральнікаў калекцый гістарычнага профілю. Стварэнне выключна археалагічных, нумізматычных, ваенна-гістарычных, археаграфічных і іншых калекцый. Дзейнасць збіральнікаў-натуралістаў.

## 8. Музейная справа ў 1920–1940-я гг.

*Музейная справа ў краінах Еўропы і ЗША.* Асаблівасці развіцця музейнай справы ў краінах Заходняй і Цэнтральнай Еўропы. Амерыканская мадэль развіцця музейнай справы з перавагай адукацыйных мэт. Рост колькасці музеяў. Развіццё мастацкіх музеяў. Гістарычныя музеі. Этнаграфічныя музеі. З'яўленне шэрагу музеяў пад адкрытым небам на амерыканскім кантыненце. Музей чалавека ў Францыі як процівага фашысцкай ідэалогіі. Прапаганда агульначалавечых каштоўнасцей. Навукова-тэхнічныя і прыродазнаўчыя музеі.

Ідэалагізацыя і палітызацыя музейнай работы ў краінах Заходняй Еўропы.

*Музейная справа ў СССР.* Уплыў рэвалюцыйных падзей 1917 г. на сутнасць музейнай дзейнасці. Станаўленне савецкай сістэмы музеяў. Прынцыпы музейнай работы ва ўмовах таталітарнага грамадства. Фарміраванне савецкіх музеяў. Першы Усерасійскі з'езд музейных супрацоўнікаў (Масква, 1930) і яго вынікі. Музей – цэнтр для арганізацыі калектыўнага мыслення мас. Развіццё музеязнаўчай думкі. Роля краязнаўчых музеяў. Прапагандысцкія мэты музеяў. Стварэнне навукова-даследчых цэнтраў распрацоўкі праблем краязнаўчай і музеязнаўчай работы. Арганізацыя падрыхтоўкі музейных кадраў. Страты ў музейнай справе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Музейная справа ў Савецкай Беларусі.* Нацыяналізацыя прыватных музейных калекцый. Пастанова СНК БССР «Аб рэгістрацыі, прыёме на ўлік і ахове помнікаў мастацтва, мінуўшчыны, побыту і мясцовасцей прыроды...» (1923). Стварэнне сеткі дзяржаўных музеяў. Фарміраванне музеяў у сістэме Інбелкульта і іншых ведамстваў. Узнікненне музеяў, прысвечаных палітычнай гісторыі. Роля мясцовай інтэлігенцыі ў стварэнні сеткі краязнаўчых музеяў. Уплыў грамадска-палітычнай сітуацыі 1930-х гг. на музейную справу. Знішчэнне музеяў і вываз помнікаў гісторыі і мастацтва за межы Беларусі.

*Музейная справа на тэрыторыі Заходняй Беларусі.* Узнікненне музеяў у Гродне, Баранавічах, Слоніме і Пінску. Беларускі музей І. Луцкевіча (Вільня, 1921).

*Дзейнасць музеяў у гады Вялікай Айчыннай вайны.* Страты музейных калекцый у час Другой сусветнай вайны. Фарміраванне калекцый, прысвечаных ваеннаму перыяду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### 9. Музейная справа ў другой палове XX – пачатку XXI ст. у краінах дальняга і бліжняга замежжа

*Музейная справа ў краінах дальняга замежжа.* Разбурэнне калекцый і музеяў падчас Другой сусветнай вайны. Лёс культурных каштоўнасцей, вывезеных падчас акупацыі. Міжнародна-прававыя нормы аб рэстытуцыі культурных каштоўнасцей.

Уплыў навукова-тэхнічнага прагрэсу і павелічэння колькасці вольнага часу на ўзрастанне значэння музеяў у агульнай культуры грамадства. Асаблівасці фарміравання і развіцця музеязнаўства як навуковай дысцыпліны, стварэнне сеткі музейных даследчых і навучальных цэнтраў у свеце. Фарміраванне сістэмы падрыхтоўкі музейных спецыялістаў.

Павелічэнне значэння міжнародных музейных арганізацый, абмен вопытам і музейнымі рэчамі паміж рознымі музеямі. Роля ЮНЕСКА, Міжнароднага савета музеяў (ІКОМ) і іншых міжнародных арганізацый у развіцці музейнай справы. Развіццё супрацоўніцтва ў галіне музейнай справы.

*Фарміраванне музеяў у краінах трэцяга свету.* Стварэнне музейных устаноў у краінах Лацінскай і Паўднёвай Амерыкі, Афрыкі і Азіі.

*Рух экамузеяў і новая музеялогія.* Музеефікацыя нематэрыяльнай спадчыны і немузейных устаноў. Тэндэнцыя да дэцэнтралізацыі і канцэптуалізацыі музеяў.

*Музейная справа ў СССР і краінах бліжняга замежжа.* Асаблівасці музейнай работы пасля Вялікай Айчыннай вайны. Аднаўленне і развіццё музейнай сеткі. Скарачэнне аднаўленчых работ у музеях у канцы 1940-х гг. Палітыка рэгламентацыі і стандартызацыі дзейнасці музеяў.

Узмацненне навукова-даследчай працы ў музеях. Стварэнне Навукова-даследчага інстытута музеязнаўства (Масква, 1948).

Змяненне сістэмы кіравання музеямі. Перадача музеяў у распараджэнне Міністэрства культуры.

*Дэмакратызацыя жыцця краіны з сярэдзіны 1950-х гг. і яе ўплыў на развіццё музеяў.* Рост грамадскай актыўнасці. Узмацненне цікавасці да гісторыка-культурнай спадчыны.

Стварэнне цэнтралізаваных музейных сістэм, музейных аб'яднанняў. Вызначэнне асноўнага напрамку дзейнасці музеяў: камплектаванне і экспанаванне помнікаў савецкага перыяду гісторыі на шкоду гісторыі іншых перыядаў.

*Пашырэнне музейнай сеткі.* Стварэнне музеяў-запаведнікаў. Музеі ў гарадах-новабудоўлях. Рост сеткі мастацкіх, гістарычных і мемарыяльных музеяў. Грамадскія і народныя музеі 1970–1980-х гг.

Музейныя выстаўкі як найбольш эфектыўная і папулярная форма сацыяльна-культурнай камунікацыі. Навуковае праектаванне экспазіцый пачатку 1980-х гг. Развіццё альтэрнатыўных форм.

Умовы захавання, уліку, вывучэння і прадстаўлення калекцый. Пытанні кіравання музеямі. Эканоміка музейнай справы. Фарміраванне сістэмы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі музейных кадраў.

Дэпалітызацыя грамадства і музейнай справы ў канцы 1980 – пачатку 1990-х гг.

## 10. Музейная справа ў Беларусі ў другой палове XX – пачатку XXI ст.

Аднаўленне дзейнасці музейных устаноў у пасляваенны перыяд у Беларусі. Страты беларускіх музеяў падчас Вялікай Айчыннай вайны. Музейнае будаўніцтва ў другой палове XX – пачатку XXI ст.

*Гістарычныя музеі. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.* Калекцыі музея. Экспазіцыя музея. Фондавая, экспазіцыйная, навукова-даследчая, культурна-адукацыйная работа музея. Музей – буйнейшы метадычны цэнтр па музей-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най і гісторыка-краязнаўчай рабоце ў Беларусі. Дом-музей I з’езда РСДРП. Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці.

*Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны* (Мінск, 1943). Заснаванне і адкрыццё музея. Асноўныя кірункі дзейнасці. Калекцыі музея. Філіялы музея. Помнік воінам-інтэрнацыяналістам (Мінск, 1996). Навуковая канцэпцыя новага музея.

*Музей абароны Брэсцкай крэпасці* (Брэст, 1956). Асноўныя кірункі дзейнасці. Калекцыі музея.

*Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту* (Мінскі р-н Мінскай вобл., 1976) – першы беларускі музей-скансен. Заснаванне і адкрыццё музея. Структурная аснова музея. Асноўныя кірункі дзейнасці. Калекцыі музея. Правядзенне народных свят на тэрыторыі музея.

*Літаратурныя музеі. Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы* (Мінск, 1944). Заснаванне і адкрыццё музея. Асноўныя кірункі дзейнасці. Калекцыі музея. Традыцыя правядзення штогадовых «Купалаўскіх чытанняў» (1946). Філіялы: Літаратурны музей у Ляўках (Аршанскі р-н Віцебскай вобл., 1945), Літаратурны музей у в. Яхімаўшчына (Маладзечанскі р-н Мінскай вобл., 1997), Літаратурны музей «Акопы» (в. Харужанцы Лагойскага р-на Мінскай вобл., 1989), Літаратурны музей у Вязынцы (Маладзечанскі р-н Мінскай вобл., 1945).

*Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа* (Мінск, 1956). Заснаванне і адкрыццё музея. Асноўныя кірункі дзейнасці. Калекцыі музея. Традыцыя правядзення традыцыйнага літаратурнага свята «Каласавіны» (1985). Філіял «Мікалаеўшчына»: мемарыяльная сядзіба «Смольня», «Акінчыцкая лясная камора», мемарыяльная сядзіба «Альбуць», мемарыяльная сядзіба «Ласток».

*Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры* (Мінск, 1987). Заснаванне і адкрыццё музея. Асноўныя кірункі дзейнасці. Калекцыі музея. Філіялы музея: Літаратурны музей Кузьмы Чорнага (в. Цімкавічы, Капыльскі р-н Мінскай вобл.), музей-сядзіба Міцкевічаў «Завоссе» (Баранавіцкі р-н Мінскай вобл.), музей-сядзіба Францішка Багушэвіча «Кушляны» (Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл.). Рэарганізацыя і аптымізацыя сеткі літаратурных музеяў. Новыя філіялы музея (Літаратурны музей Максіма Багдановіча і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Мастацкія музеі. Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь* (Мінск, 1939). Аднаўленне дзейнасці музея ў пасляваенны час. Асноўныя кірункі дзейнасці. Калекцыі музея. Выданне музеем навуковых каталогаў. Філіялы музея: Музей беларускага народнага мастацтва (в. Раўбічы Мінскага р-на, 1977), Музей В. К. Бялыніцкага-Бірулі (Магілёў, 1978), Дом-музей Ваньковічаў. Культура і мастацтва першай паловы XIX ст. (Мінск, 1984).

*Мемарыяльны музей-майстэрня З. І. Азгура* (Мінск, 1996). Заснаванне і адкрыццё музея. Асноўныя кірункі дзейнасці. Калекцыі музея.

*Магілёўскі абласны мастацкі музей імя П. В. Масленікава* (Магілёў, 1990). Заснаванне і адкрыццё музея. Асноўныя кірункі дзейнасці. Калекцыі музея. Выставачная дзейнасць.

*Прыродазнаўчыя музеі. Музей прыроды і экалогіі Рэспублікі Беларусь* (Мінск, 1991). Заснаванне і адкрыццё музея. Асноўныя кірункі дзейнасці. Калекцыі музея.

*Комплексныя музеі. Брэсцкі абласны краязнаўчы музей* (1945). Заснаванне і адкрыццё музея. Асноўныя кірункі дзейнасці. Калекцыі музея. Філіялы: археалагічны музей «Бярэсце», «Камянецкая вежа», «Выратаваныя мастацкія каштоўнасці», Мастацкі музей.

*Віцебскі абласны краязнаўчы музей* (1918). Аднаўленне дзейнасці музея ў пасляваенны час. Асноўныя кірункі дзейнасці. Калекцыі музея. Філіялы: музей-сядзіба І. Я. Рэпіна «Здраўнёва» (Віцебскі р-н, 1988), Мастацкі музей (Віцебск, 1992).

*Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей* (1920). Аднаўленне дзейнасці музея ў пасляваенны час. Асноўныя кірункі дзейнасці. Калекцыі музея.

*Магілёўскі абласны краязнаўчы музей* (1867). Аднаўленне дзейнасці музея ў пасляваенны час. Асноўныя кірункі дзейнасці. Калекцыі музея. Філіял: Музей этнаграфіі (Магілёў, 1996).

*Мінскі абласны краязнаўчы музей* (Маладзечна, 1959). Заснаванне і адкрыццё музея. Асноўныя кірункі дзейнасці. Калекцыі музея.

*Гомельскі палацава-паркавы ансамбль*. Заснаванне і адкрыццё музея. Асноўныя кірункі дзейнасці. Калекцыі музея. Асноўныя аб’екты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Замкавы комплекс «Мір» XVI–XX стст.* (г.п. Мір, Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл., 1987). Рэстаўрацыя і музеефікацыя замка. Асноўныя кірункі дзейнасці. Калекцыі музея.

*Гісторыка-культурныя музеі-запаведнікі. Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік* (1967). Заснаванне і адкрыццё музея-запаведніка, яго склад. Асноўныя кірункі дзейнасці. Калекцыі музея.

*Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж»* (1993). Заснаванне і адкрыццё музея-запаведніка, яго склад. Асноўныя кірункі дзейнасці. Калекцыі музея.

*Гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе»* (1997). Заснаванне і адкрыццё музея-запаведніка, яго склад. Асноўныя кірункі дзейнасці. Калекцыі музея.

## Раздзел 3. АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

**Ключавыя словы:** *гісторыка-культурная спадчына, матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці, нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці, помнік, калекцыя, ахова гісторыка-культурнай спадчыны.*

### 1. Асаблівасці станаўлення і развіцця заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў 20-я гг. XX – пачатку XXI ст.

*Гісторыка-культурныя каштоўнасці і іх класіфікацыя.* Вызначэнне паняцця гісторыка-культурнай спадчыны. Гісторыка-культурныя каштоўнасці і іх класіфікацыя. Матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці. Нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці. Катэгорыі гісторыка-культурных каштоўнасцей.

*Асаблівасці станаўлення і развіцця заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў 20–40-я гг. XX ст.* Асаблівасці заканадаўства ў часы Расійскай імперыі. Адметныя асаблівасці заканадаўства аб ахове помнікаў гісторыі і культуры першых гадоў Савецкай улады. Першыя дзяржаўныя органы па ўліку і ахове помнікаў. Асноўныя прынцыпы ахоўнай дзейнасці дзяржавы. Пастанова Саўнаркома аб рэгістрацыі, прыёме на ўлік і ахове помнікаў мастацтва, старажытнасцей, побыту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Польскае заканадаўства ў галіне аховы помнікаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.).

Сістэма аховы, уліку і выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны і рэгулявання яе ў 40–50-я гг. XX ст.

*Заканадаўчыя асновы аховы помнікаў у 60–80-я гг. XX ст.* Першы закон БССР «Аб ахове помнікаў культуры» (1969). Закон БССР «Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры» (1978). Інструкцыі Міністэрства культуры СССР па арганізацыі зон аховы нерухомых помнікаў гісторыі і культуры.

Канстытуцыя СССР (1977). Парадак уліку, забеспячэння захаванасці, выкарыстання і рэстаўрацыі нерухомых помнікаў гісторыі і культуры. Пастанова Савета Міністраў БССР «Аб фактах грубых парушэнняў заканадаўства аб ахове помнікаў гісторыі і культуры» (1984). Рэкамендацыі аб забеспячэнні выканкамаў мясцовых Саветаў дэпутатаў Зводам помнікаў гісторыі і культуры.

*Заканадаўства ў галіне аховы помнікаў у 90-я гг. XX – пачатку XXI ст.* Новы перыяд у галіне аховы культурнай спадчыны краіны. Законы «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» (2006), «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» (1991), «Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» (2005), «Аб асновах архітэктурнай і горадабудаўнічай дзейнасці» (1994), «Аб асабліва захоўваемых прыродных тэрыторыях» (1994), «Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь» (1998).

Нарматыўна-прававыя акты 2001–2003 гг. Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб першачарговых мерах па захаванні і адраджэнні гістарычных цэнтраў гарадоў Беларусі» (2001), «Аб пытаннях захавання гісторыка-культурнай спадчыны» (2002), Палажэнне аб ахове археалагічных аб'ектаў пры правядзенні земляных і будаўнічых работ (2002). Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб некаторых мерах па рэстаўрацыі палацава-паркавага ансамбля горада Нясвіжа і замкавага комплексу ў г.п. Мір» (2002).

Міжнароднае права аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Канвенцыя аб абароне культурных каштоўнасцей у выпадку ўзброеннага канфлікту (Гаага, 1954). Канвенцыя аб мерах, накіраваных на забарону і папераджэнне незаконнага ўвозу, вывазу і перадачы права маёмасці на культурныя каштоўнасці (Парыж, 1970). Канвенцыя аб абароне сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны (1972).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэкамендацыя аб ахове рухомых культурных каштоўнасцей (1978). Канвенцыя аб выкрадзеных або незаконна вывезеных культурных каштоўнасцях (1995, Рым). Канвенцыя аб ахове падводнай культурнай спадчыны (2001, Парыж). Міжнародная канвенцыя аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (2003, Парыж). Еўрапейская канвенцыя аб ахове археалагічнай спадчыны (Лондан, 1969). Роля ЮНЕСКА, ІКОМ і іншых міжнародных арганізацый у развіцці музейнай справы.

## 2. Кіраванне і кантроль у галіне гісторыка-культурнай спадчыны

*Сістэма органаў аховы помнікаў і іх паўнамоцтвы ў Рэспублікі Беларусь.* Асаблівасці дзяржаўнай палітыкі ў галіне ўліку і аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Сістэма органаў аховы гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Паўнамоцтвы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Задачы і функцыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Функцыі навукова-метадычнага савета Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

*Сістэма органаў дзяржаўнага кіравання архітэктурнай і горадабудаўнічай дзейнасцю.* Дзяржаўнае кіраванне ў XIX – пачатку XX ст. Дзяржаўнае кіраванне архітэктурнай і горадабудаўнічай дзейнасцю ў БССР і Заходняй Беларусі ў XX ст. Паўнамоцтвы органаў архітэктуры і Дзяржбуднагляду ў галіне аховы помнікаў гісторыі і культуры. Асноўныя горадабудаўнічыя рэсурсы. Заказчыкі на праектаванне, рэканструкцыю і рэстаўрацыю будынкаў. Распрацоўка і зацвярджэнне праектнай дакументацыі. Абавязкі заказчыка. Аўтарскі нагляд. Віды парушэнняў заканадаўства аб архітэктурнай і горадабудаўнічай дзейнасці.

Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Структура і статутныя задачы таварыства. Беларускі фонд культуры і яго задачы. Праграма «Спадчына».

*Функцыі і задачы Дзяржаўнай гісторыка-культурнай экспедыцыі па выратаванні помнікаў гісторыі і культуры Беларусі ў раёнах, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС.* Дзяржаўная праграма па ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. «Звод помнікаў археалогіі чарнобыльскай зоны». Збор і апрацоўка звестак аб наяўнасці помнікаў гісторыі, архітэктуры і культуры ў населеных пунктах, якія падлягалі адсяленню. Унікальны фонд твораў традыцыйнай культуры і мас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тацтва Музея старажытнабеларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь.

*Кансервацыя помнікаў і дэзактывацыя твораў мастацтва, каштоўных кніг, абразоў.* Распрацоўка спосабаў іх захавання. Спыненне дзейнасці Дзяржаўнай гісторыка-культурнай экспедыцыі па выратаванні помнікаў гісторыі і культуры Беларусі.

## 3. Дзяржаўны ўлік гісторыка-культурных каштоўнасцей

*Улік гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Выяўленне і вывучэнне гісторыка-культурнай спадчыны.* Дакументальная навуковая фіксацыя. Крытэрыі адбору каштоўнасцей. Парадак надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Складанне пераліку матэрыяльных аб'ектаў і нематэрыяльных праяўленняў чалавечай творчасці, вартасці якіх недастатковыя для надання ім статусу каштоўнасці. Праблемы і перспектывы ўдасканалення дзяржаўнага ўліку гісторыка-культурных каштоўнасцей.

*Структура Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей.* Парадак уключэння аб'ектаў у дзяржаўны спіс. Структура дзяржаўнага спіса. Гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія знаходзяцца ў межах краіны. Легальнае знаходжанне каштоўнасцей па-за межамі Беларусі. Гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія незаконна знаходзяцца па-за межамі Рэспублікі Беларусь. Каштоўнасці пад пагрозай знікнення або знішчэння.

Перагляд Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь і яго публікацыя. Комплексныя каштоўнасці ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей. Пазбаўленне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь.

*Прынцыпы захавання гісторыка-культурных каштоўнасцей.* Прынцыпы захавання гісторыка-культурных каштоўнасцей. Умовы ўтрымання і выкарыстання матэрыяльных каштоўнасцей. Парадак правядзення работ на іх. Абмежаванні дзейнасці яе ўласнікаў і карыстальнікаў. Абмежаванне або поўная забарона руху транспартных сродкаў на дарогах. Абмежаванне або поўная забарона дзейнасці, якая стварае пагрозу існаванню ці тэхнічнаму стану каштоўнасці. Заканадаўчыя абмежаванні на дзейнасць юрыдычных асоб.

*Захаванне і выкарыстанне гісторыка-культурных каштоўнасцей.* Захаванне каштоўнасцей у Расійскай імперыі. Дзяржаў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ная, царкоўная і прыватная маёмасць. Нацыяналізацыя прыватных каштоўнасцей у 1917–1918 гг. Сітуацыя ў Заходняй Беларусі, СССР. Забеспячэнне аховы асяроддзя матэрыяльных нерухомых каштоўнасцей. Рэжым утрымання і функцыянальнага выкарыстання іх пры рэканструкцыі гістарычных населеных пунктаў. Зоны аховы нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей. Інструкцыя па арганізацыі зон аховы нерухомых помнікаў гісторыі і культуры. Праекты зон аховы. Індывідуальныя ўмовы ўтрымання і выкарыстання матэрыяльных каштоўнасцей. Рэжымы ўтрымання зон аховы. Ахоўныя дошкі. Форма і змест ахоўнай дошкі.

### 4. Уласнасць на гісторыка-культурныя каштоўнасці

*Формы ўласнасці на гісторыка-культурныя каштоўнасці.* Права ўласнасці. Парадак заключэння *ахоўных абавязацельстваў*. Правы і абавязкі ўласнікаў. Абмежаванне правоў уласніка і карыстальніка матэрыяльнай каштоўнасці. Вызначэнне ўмоў арэнды каштоўнасцей. Парадак змены ўласніка гісторыка-культурнай каштоўнасці.

*Уласнасць на архіўныя фонды і архіўныя дакументы.* Закон «Аб Нацыянальным архіўным фондзе і архівах у Рэспубліцы Беларусь». Дакументы Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь. Спісы крыніц фарміравання Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь. Установы дзяржаўнай архіўнай службы Рэспублікі Беларусь. Звод Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь. Уласнасць на архіўныя фонды і архіўныя дакументы.

Ахоўныя абавязацельствы паміж дзяржавай і ўладальнікам архіўных дакументаў. Парадак выдачы ахоўных абавязацельстваў. Права ўласнасці на архіўныя дакументы пры рэарганізацыі, ліквідацыі, прыватызацыі юрыдычнай асобы ці страце ўласніка.

*Уласнасць на прадметы музейнага фонду Рэспублікі Беларусь.* Закон «Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь». Задачы музейнага фонду Рэспублікі Беларусь. Склад музейнага фонду Рэспублікі Беларусь. Віды музеяў з улікам форм уласнасці. Шляхі камплектавання музейнага фонду. Уключэнне музейных прадметаў і музейных калекцый у музейны фонд Рэспублікі Беларусь і іх выключэнне. Цэнтралізаваны ўлік музейных прадметаў і музейных калекцый. Роля экспертных камісій Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і фондава-заку-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пачных камісій музеяў. Кантроль за станам і выкарыстаннем музейнага фонду Рэспублікі Беларусь.

*Вызначэнне права ўласнасці на гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія не маюць уласніка. Нерухомыя і рухомыя матэрыяльныя каштоўнасці.* Нерухомыя матэрыяльныя каштоўнасці, знойдзеныя на складзе ці на тэрыторыі аб'екта, якому нададзены статус каштоўнасці. Прававыя вынікі знаходкі скарбу. Грамадзянска-прававыя вынікі безгаспадарчага выкарыстання гісторыка-культурных каштоўнасцей.

## 5. Аднаўленне гісторыка-культурнай спадчыны

*Віды работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях.* Віды работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях. Рамонт і дагляд. Натурныя даследаванні. Правядзенне навуковых даследаванняў.

*Аб'екты кансервацыі. Віды кансервацыі.* Кансервацыя руін. *Рэстаўрацыя* і яе мэтазгоднасць. Методыка рэстаўрацыйных работ. Доўгатэрміновая праграма распрацоўкі і здзяйснення праектаў рэгенерацыі гарадской забудовы ў 2002–2015 гг. Правядзенне даследчых работ па вызначэнні меж гістарычных цэнтраў гарадоў. Выкананне гістарычных даследаванняў, інвентарызацыі і пашпартызацыі гістарычнай забудовы. Зоны аховы ў гістарычных гарадах.

*Парадак правядзення работ на матэрыяльных каштоўнасцях.* Прававая паслядоўнасць арганізацыі навукова-даследчых, праектных і рэстаўрацыйных работ на помніках. Сістэма атрымання і выдачы адпаведнай зыходнай дазваляльнай дакументацыі, яе структура. Сертыфікаты на правядзенне работ на матэрыяльных каштоўнасцях. Сістэма атрымання дазволу на даследаванне археалагічных аб'ектаў. Парадак правядзення работ на матэрыяльных каштоўнасцях. Навуковае кіраванне і прававая роля навуковага кіраўніка ў арганізацыі і правядзенні навуковых, праектных і вытворчых работ па рэстаўрацыі.

*Ахова малых гарадоў (мястэчак).* Малыя гарады як захавальнікі гістарычнай і культурнай спадчыны. Мястэчкі Беларусі, спецыфічныя асаблівасці іх планіроўкі. Захаванне прынцыпаў развіцця і рэгіянальнай спецыфікі малых гарадоў. Праблемы ўдасканалення архітэктурнага і прасторавага асяроддзя невялікіх гарадскіх пасяленняў. Архітэктурны савет краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (АССЕЕ). Разгляд пытання аб устойлі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вых каштоўнасцях архітэктуры малых гарадоў на кангрэсе Міжнароднага саюза архітэктараў у Стамбуле.

*Ахова і прыстасаванне помнікаў грамадзянскага дойлідства.* Гістарычныя цэнтры гарадоў, гарадскія гістарычныя прадмесці. Гістарычныя ансамблі і сучасная забудова горада. Помнікі грамадзянскага дойлідства, іх аднаўленне і адаптацыя. Навучальна-адукацыйныя збудаванні, іх захаванне і прыстасаванне. Паштовыя станцыі і вакзалы, іх выкарыстанне. Тэатральна-відовішчныя збудаванні. Іх захаванне і прыстасаванне. Корчмы, рэстараны, гасцініцы як асобная катэгорыя аб'ектаў грамадзянскага дойлідства, іх захаванне. Гандлёвыя рады, іх захаванне і прыстасаванне. Гістарычнае жылое асяроддзе: прыклады захавання і адаптацыі. Гістарычныя аб'екты манументальнай архітэктуры і іх уключэнне ў структуру горадабудаўнічай забудовы і гарадскіх рэкрэацый.

*Ахова і прыстасаванне помнікаў народнага дойлідства.* Пастанова Савета Міністраў БССР аб стварэнні Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. Структура музея. Праблемы фарміравання музеяў пад адкрытым небам. Актуальнасць выяўлення помнікаў драўлянага дойлідства. Аптымальныя формы захавання і прыстасавання да сучасных умоў помнікаў народнага дойлідства. Формы і метады захавання помнікаў драўлянай архітэктуры. Праблемы захавання помнікаў драўлянага дойлідства.

*Ахова помнікаў прыроды.* Першыя пастановы СНК БССР аб ахове помнікаў прыроды. Ахова помнікаў прыроды ў Заходняй Беларусі. Сістэматычная ахова ўнікальных аб'ектаў. Пастанова Савета Міністраў БССР «Аб ахове помнікаў прыроды на тэрыторыі Беларускай ССР».

Актуальнасць праблемы захавання паркаў і асноўных элементаў гістарычнага паркавага ландшафту. Класіфікацыя паркаў з улікам ступені іх захаванасці і стылявых асаблівасцей. Меры па захаванні паркавых кампазіцый, збудаванняў.

Структура аховы і выкарыстання помнікаў прыроды і экалогіі: запаведнікі і заказнікі на тэрыторыі Беларусі, нацыянальныя паркі, экамузеі. Гісторыка-культурны запаведнік «Заслаўе». Нацыянальны гісторыка-культурны запаведнік «Нясвіж».

*Захаванне, кансервацыя і рэстаўрацыя археалагічных помнікаў.* Прадмет археалагічных раскопак. Ахова археалагічных аб'ектаў падчас земляных і будаўнічых работ. Правілы заклю-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чэння і выканання дагавораў будаўнічага падраду. Праектна-каштарысная дакументацыя на правядзенне земляных і будаўнічых работ. Правы, абавязкі і меры па ахове археалагічных аб’ектаў.

Хартыя Міжнароднага савета помнікаў і славутых месцаў (ICOMOS) па ахове і выкарыстанні археалагічнай спадчыны. Еўрапейская археалагічная канвенцыя. Падводная археалогія як новы кірунак гістарычнай навукі. Канвенцыя ЮНЕСКА аб ахове падводнай культурнай спадчыны. Аб’екты падводнай культурнай спадчыны Беларусі. Праблемы нелегальнага скарбашукальніцтва.

## 6. Захаванне, кансервацыя і рэстаўрацыя музейных прадметаў

*Дакументальныя помнікі. Формы і метады іх захавання.* Распрацоўка прававой і нарматыўнай базы па захаванні дакументальных помнікаў. Дзяржаўны ўлік дакументальных помнікаў. Палажэнне аб Нацыянальным фондзе кніжных помнікаў Рэспублікі Беларусь.

Праект «Мэтавая праграма па захаванні, кансервацыі і рэстаўрацыі дакументальных помнікаў».

Стварэнне Нацыянальнага міжведамаснага цэнтра захаванасці дакументаў на падставе сучасных тэхналогій. Капіраванне, мікрафільмаванне, факсімільнае ўзнаўленне арыгіналаў і алічбоўка дакументаў. Сучасныя камп’ютарныя тэхналогіі. Лабараторыя кансервацыі і рэстаўрацыі дакументаў. Стварэнне CD-ROM. Праблема захаванасці і забеспячэння доступу да помнікаў.

*Рэстаўрацыя і кансервацыя помнікаў твораў жывапісу.* Паняцце кансервацыі і рэстаўрацыі жывапісу. Прычыны разбурэння абразоў. Біялагічныя і механічныя пашкоджанні. Метады даследавання. Сучасныя сродкі аналізу карцін: візуальнае даследаванне, рэнтгенаграфія, фатаграфаванне ў ўльтрафіялетавых і інфрачырвоных промнях і інш. Вывучэнне тэхналогіі стварэння абразоў. Абразы як шматкампанентная структура. Выпраўленне механічных пашкоджанняў. Прафілактычная заклейка. Тэхналогія ўмацавання ляўкасу і фарбавага слоя. Асноўныя спосабы замацавання ляўкасу. Выдаленне запісаў, пацямнелай аліфы. Аднаўленне абразоў. Метад «урэзкі». Асноўныя правілы захавання абразоў і карцін у выставачных памяшканнях і фондах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Рэстаўрацыя і кансервацыя фрэсак*. Паняцце кансервацыі і рэстаўрацыі фрэсак. Тэхналогіі насценнага жывапісу. Віды фрэсак. Аснова насценнага жывапісу. Грунт. Пігменты. Вяжучае рэчыва. Вывучэнне прычын і відаў разбурэння фрэсак. Віды зруйнавання фрэсак. Складанасці рэстаўрацыі фрэсак. Метады і спосабы рэстаўрацыі фрэсак. Рэстаўрацыя фрэсак Сафійскага сабора XI ст. у Полацку. Рэстаўрацыя фрэсак Спаса-Праабражэнскай царквы Ефрасіннеўскага манастыра XII ст.

*Захаванне і рэстаўрацыя вырабаў з тканін, са скуры і косці*. Галоўныя прычыны разбурэння вырабаў з тканін. Захаванне археалагічных тканін. Тэмпературна-вільготнасны рэжым захавання. Вызначэнне ступені захаванасці. Захаванне і рэстаўрацыя шпалер і дываноў. Кансервацыя вырабаў са скуры. Вырабы з косці, рэстаўрацыя і іх захаванне. Хімічны склад косці і дэструкцыя матэрыялу. Праблемы біязабруджвання косці. Спосабы выдалення забруджванняў і плям. Сухая чыстка. Спосаб прамыўкі. Аднаўленне страт, таніроўка, кансервацыя.

*Рэстаўрацыя і кансервацыя прадметаў з дрэва*. Фактары, якія вызначаюць фізічнае старэнне прадметаў з дрэва. Віды дэфектаў і спосабы іх ліквідацыі. Матэрыялы, інструменты і абсталяванне для правядзення рэстаўрацыйных работ. «Археалагічнае дрэва». Метад кансервацыі «археалагічнага дрэва». Методыка прафесара В. Я. Віхрова. Кантроль колеру і ідэнтыфікацыя матэрыялаў. Асаблівасці і асноўныя этапы рэстаўрацыі і кансервацыі гістарычнай мэблі. Прынцыпы навуковай рэстаўрацыі мэблі. Рэстаўрацыя канструктыўных і дэкаратыўных дэталяў, фурнітуры. Рэстаўрацыя мяккіх элементаў мэблі.

*Рэстаўрацыя і кансервацыя музейных прадметаў з металу*. Спосабы і прыёмы ачысткі і рэстаўрацыі музейных прадметаў з металу. Механічныя, хімічныя, тэрмічныя метады апрацоўкі металу. Выдаленне іржы і забруджванняў з прадметаў з чорнага металу – чыгуну, сталі, жалеза. Віды пацiны. Захаванне вырабаў з каштоўных металаў. Спецыфіка працы з прадметамі, якія маюць мастацкі рэльеф або надпісы. Методыка выкарыстання кансервантаў. Спецыфіка рэстаўрацыі і кансервацыі музейных прадметаў з медзі, латуні, бронзы. Ачыстка і кансервацыя манет і медалёў з медзі, бронзы, нікеля, срэбра. Нумізматычныя калекцыі і іх захаванне.

*Рэстаўрацыя і кансервацыя керамічных вырабаў, фарфору, шкла*. Захаванне і рэстаўрацыя керамічных музейных прад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

метаў. Тэхналогія вырабу прадметаў, асартымент – фарфор, фаянс, бісквіт, маёліка, тэракота. Прычыны разбурэння керамікі: механічныя пашкоджванні, хімічныя і біялагічныя фактары, папярэднія рэстаўрацыі. Ачыстка керамічных вырабаў – сухая і вільготная чыстка. Выдаленне налётаў і напластаванняў керамікі. Выдаленне старых клеевых сродкаў. Выдаленне сцяжак. Папаўненне структурных страт. Таніроўка. Праблемы рэстаўрацыі фарфору. Рэстаўрацыя і захаванне вырабаў са шкла. Археалагічнае шкло. Ірызацыя археалагічнага шкла.

## 7. Адміністрацыйная і крымінальная адказнасць за парушэнне заканадаўства аб ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях (2003). Закон «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» (2006). Парушэнне заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Невыкананне патрабаванняў ахоўных абавязацельстваў у адносінах да гісторыка-культурных каштоўнасцей. Парушэнне парадку і ўмоў вытворчасці работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях. Парушэнне рэжыму аховы асяроддзя гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Злачынствы супраць гісторыка-культурнай спадчыны. Пашкоджанне і знішчэнне гісторыка-культурных каштоўнасцей. Кантрабанда. Незварот на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь гісторыка-культурных каштоўнасцей. Незаконнае выкарыстанне ахоўных знакаў гісторыка-культурных каштоўнасцей у час ваенных дзеянняў. Адказнасць за злачынствы. Тэрміны накладання адміністрацыйнага спагнання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛІТАРАТУРА

*1.* «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь»: Закон Рэсп. Беларусь: прыняты 9 студз. 2006 г., № 98-З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2006. – № 9. – С. 68–91.

*2.* «Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь»: Закон Рэсп. Беларусь: прыняты 12 снеж. 2005 г., № 70-З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2010. – № 197. – С. 7–14.

*3.* Архитектурное наследие и реставрация (реставрация памятников истории и культуры России): сб. науч. тр. / под общ. ред. М. Дворяшина. – М. : Реставрация, 1986. – 272 с.

*4. Багласаў, С. Г.* Праблемы аднаўлення страчаных форм і функцый помнікаў архітэктуры Беларусі пры іх рэстаўрацыі / С. Г. Багласаў // Помнікі старажытнабеларускай культуры. Новыя адкрыцці. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – С. 126–132.

*5. Бамбешка, І. І.* З гісторыі стварэння і дзейнасці першага грамадскага краязнаўчага музея ў Беларусі / І. І. Бамбешка // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры. – 2004. – № 3. – 119–123.

*6. Барри, Лорд.* Менеджмент в музейном деле / Барри Лорд, Гейл Д. Лорд ; пер. с англ. Э. Н. Гусинского и Ю. И. Турчаниновой ; под ред. А. Б. Голубовского. – М. : Логос, 2002. – 256 с.

*7.* Беларускія музеі. Гісторыя. Хроніка. Сучаснасць / уклад. А. М. Калбаска; Беларус. ін-т праблем культуры. – Мінск : БелІПК, 1998. – 130 с. – (Музейныя сшыткі : навук.-метад. зб.; вып. 4).

*8. Бярэйшык, Л. У.* Музеі замежных краін : вучэб. дапам. для студэнтаў гіст. фак. спец. 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках) : у 2 ч. Ч. 2. Музеі Азіі, Амерыкі, Аўстраліі, Афрыкі / Л. У. Бярэйшык, А. А. Гужалоўскі. – Мінск : БДУ, 2008. – 247 с.

*9.* Восстановление памятников культуры: (Проблемы реставрации) / предисл. и общ. ред. Д. С. Лихачева. – М. : Искусство, 1981. – 232 с.

*10.* Изучение и научное описание памятников материальной культуры : сб. ст. / сост. и ред. А. М. Разгон (отв. ред.) и Н. П. Финягина. – М. : Сов. Россия, 1972. – 272 с.

*11. Грицкевич, В. П.* История музейного дела до конца XVIII в. / В. П. Грицкевич. – СПб. : СПбУКИ, 2004. – 408 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12. *Грицкевич, В. П.* История музеев мира: учеб. пособие для студентов ист. фак. / В. П. Грицкевич, А. А. Гужаловский. – Минск : БГУ, 2003. – 284 с.

13. *Гужалоўскі, А. А.* Гісторыя музейнай справы Беларусі : вучэб.-метад. дапам. / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : БДУ, 2012. – 303 с.

14. *Гужалоўскі, А. А.* Музеі Беларусі (1918–1941) / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : Нац. архіў Рэсп. Беларусь, 2002. – 176 с.

15. *Гужалоўскі, А. А.* Музеі Беларусі (1941–1991) / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : Нац. архіў Рэсп. Беларусь, 2004. – 218 с.

16. *Гужалоўскі, А. А.* Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : Нац. архіў Рэсп. Беларусь, 2001. – 124 с.

17. *Душкина, Н.* Понятие подлинности в современной теории и практике реставрации / Н. Душкина // Науч.-информ. сб. – М., 1996. – Вып. 3. – С. 3–8.

18. История и теория реставрации памятников архитектуры: сб. науч. тр. / под ред. А. С. Щенкова. – М. : Центр. науч.-исслед. и проектный ин-т по градостроительству, 1986. – 98 с.

19. *Калбаска, А. М.* Музейны дыярыуш, ці Уваходзіны ў новую музеялогію / А. М. Калбаска. – Мінск : БелІПК, 1999. – 148 с.

20. *Колабава, І. Н.* Нумізматычныя калекцыі ў культурна-адукацыйнай дзейнасці рэгіянальных музеяў / І. Н. Колабава // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2011. – № 2. – С. 123–129.

21. *Лакотка, А. І.* Пад стрэхамі прашчураў / А. І. Лакотка. – Мінск : Полымя, 1995. – 384 с.

22. *Локотко, А. И.* Архитектурное наследие Беларуси. Развитие традиций, охрана и реставрация / А. И. Локотко. – Минск : Право и экономика, 2004. –303 с.

23. *Ломунова, А. К.* Воспитание музейной культуры посетителя: конспект лекций / А. К. Ломунова. – М. : Б.и., 1988. – 29 с.

24. *Лупашка, І. Г.* Матэрыялы перыяду Вялікай Айчыннай вайны ў фондах Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры / І. Г. Лупашка // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. – 2005. – № 4. – С. 114–118.

25. *Мартыненко, И. Э.* Законодательство об охране историко-культурного наследия и прокурорский надзор за его исполнением / И. Э. Мартыненко. – Минск : Тесей, 2001. – 191 с.

26. *Мартыненко, И. Э.* Международные национальные правовые системы охраны историко-культурного наследия госу-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дарств–участников СНГ : учеб. пособие / И. Э. Мартыненко. – М. : Зерцало-М, 2012. – 943 с.

27. *Мартыненко, И. Э.* Правовая защита культурного наследия : учеб. пособие / И. Э. Мартыненко. – Минск : ЕГУ, 2003. – 240 с.

28. *Михайловская, А. И.* Музейная экспозиция (организация и техника) / А. И. Михайловская. – 2-е изд., доп. – М. : Сов. Россия, 1964. – 517 с.

29. Музеі Беларусі : інфармацыя аб музеях сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь / склад. А. Б. Сташкевіч [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2001. – 272 с.

30. Музееведение. Музеи исторического профиля: учеб. пособие для вузов по специальности «история» / под ред. К. Г. Левыкина, В. Хербста. – М. : Высш. шк., 1988. – 431 с.

31. Музееведческая мысль в России XVIII – XX веков : сб. док. и материалов / отв. ред. Э. А. Шулепова. – М. : Эстерна, 2010. – 960 с.

32. Музеи мира : сб. науч. тр. / отв. ред. Е. Е. Кузьмина ; НИИ культуры. – М., 1991. – 377 с.

33. Музейны прадмет : тэорыя, метадалогія, практыка: матэрыялы навук.-практ. семінара, 27–28 лістап. 1996 г. / рэдкал.: В. Рабкоў (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 1997. – 102 с.

34. *Нароўская, А. М.* Актуальныя праблемы сучаснай музеялогіі / А. М. Нароўская // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2008. – № 10. – С. 123–128.

35. *Несцярчук, Л. М.* Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы / Л. М. Несцярчук. – Мінск : БелТА, 2003. – 283 с.

36. Основы музееведения : учеб. пособие / отв. ред. Э. А. Шулепова. – М. : Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2010. – 432 с.

37. *Півавар, М. В.* Музеі Віцебска на пачатку XXI ст. : манаграфія / М. В. Півавар. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2012. – 180 с.

38. *Подъяпольский, С. С.* Реставрация памятников архитектуры : учеб. пособие для вузов / С. С. Подъяпольский [и др.] ; под общ. ред. С. Подъяпольского. – М. : Стройиздат, 1988. – 264 с.

39. *Поляков, Т. П.* Мифология музейного проектирования, или «Как делать музей?» – 2 / Т. П. Поляков. – М. : Рос. ин-т культурологии, 2003. – 454 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*40. Сапега, Т. А.* Асноўныя ўласцівасці музейнага экспаната / Т. А. Сапега // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры. – 2004. – № 3. – С. 119–123.

*41. Сергеев, А.* Виды памятников истории и культуры по советскому законодательству / А. Сергеев // Сов. государство и право. – 1990. – № 9. – С. 91–92.

*42. Сергеев, А. П.* Гражданско-правовая охрана культурных ценностей в СССР / А. П. Сергеев. – Л. : Ленингр. гос. ун-т, 1990. – 190 с.

*43. Сотникова, С. Н.* Музеология: пособие для вузов / С. Н. Сотникова. – М. : Дрофа, 2004. –192 с.

*44. Старцева, Л. А.* Коллекции музеев мира как историографический источник изучения художественного творчества женщин // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2005. – № 4. – С. 110–113.

*45. Столяров, Б. А.* Музейная педагогика. История, теория, практика: учеб. пособие / Б. А. Столяров. – М. : Высш. шк., 2004. – 216 с.

*46. Трусаў, А. А.* Беларускае кафлярства / А. А. Трусаў. – Мінск : БелІПК, 1993. – 55 с.

*47. Трусов, О. А.* Памятники монументального зодчества Белоруссии XI–XVII вв.: архитект.-археологический анализ / О. А. Трусов. – Минск : Наука и техника, 1988. – 160 с.

*48. Шляхтина, Л. М.* Основы музейного дела: теория и практика / Л. М. Шляхтина. – М. : Высш. шк., 2005. – 183 с.

*49. Юренева, Т. Ю.* Музееведение: учебник для высшей школы / Т. Ю. Юренева. – М. : Акад. проект, 2003. – 560 с.

*50. Юренева, Т. Ю.* Музей в мировой культуре / Т. Ю. Юренева. – М. : Русское золото – РС, 2003. – 536 с.

*51. Burcaw, G. E.* Introduction to museum work / G. Ellis Burcaw. – 3rd ed. – [S. l.] : AltaMira, 1997. – 237 p.

*52. Cameron, D. F.* A viewpoint : the museum as a communications system and implications for museum and education / D. F. Cameron // Curator. – 1968. – № 1. – P. 33–40.

*53. Crosbie, M. J.* Designing the world's best museums and art galleries / Michael J. Crosbie. – Mulgrave : The Images Publishing, 2003. – 167 p. : il.

*54. Hein, H. S.* The museum in transition / Hilde S. Hein. – Washington : Smithsonian Inst. PressLondon, 2000. – 203 p.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

55. *Huper-Grinhill, E.* New communication model for museum / E. Huper-Grinhill // The educational role of the museum. – London ; New York : Routledge, 1994. – P. 17–26.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ПРАГРАМА-МІНІМУМ**
**кандыдацкага экзамену па спецыяльнасці**
24.00.03 – музеязнаўства,
кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб’ектаў
(культуралогія)

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. Д. Захарэвіч

Падпісана ў друк 2014. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 2,03. Ул.-выд. арк. 1,62. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ